УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_______________ А.І.Жук
«11» 11 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-1-71/2024 вуч.

# АНТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА І ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА І АДРАДЖЭННЯ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы))**

2024 г.

Сканировано с CamScanner

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0113-02-2023 (02.08.2023, №225), вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура (23.02.2023, №048 – 2023/у); Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) (23.02.2023, №050 – 2023/у); Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) (23.02.2023, №049 – 2023/у))

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Т.М.Тарасава, прафесар кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Г.К.Тычко, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», доктар філалагічных навук, прафесар;
Н.У. Чайка, прафесар кафедры моваазнаўства і лінгвадыдактыкі УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» М.Ф.Кавалеўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 от 25.03.2024 г.)

Загадчык кафедры І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 6 ад 16.04 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

Сканировано с CamScanner

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» – вучэбная дысцыпліна, якая ўваходзіць у цыкл дысцыплін літаратуразнаўчага характару, якія вывучаюць літаратурныя працэсы асобных краін свету розных перыядаў як кампаненты сусветнага літаратурнага працэсу. Аб’ектам вывучэння вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца лепшыя творцы сусветнага класічнага пантэона, якія вызначаюць асноўныя кірункі развіцця літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння і маюць неперахodзячае значэнне ў стагоддзях. Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны заключаецца ў асаблівай увазе да тых аўтараў і твораў, якія адыгралі значную ролю ў развіцці іншанацыянальнага літаратурнага працэсу і дапамагаюць больш выразна акрэсліць месца беларускіх пісьменнікаў у свеце і прадстаўнікоў іншых народаў у Беларусі, убачыць беларускую літаратуру сярод літаратур замежных краін на розных этапах іх развіцця, зразумець, што новае ў прачытанні сусветна вядомых аўтараў адкрылі нашы суайчыннікі, якім чынам беларуская літаратура і яе творцы ўздымаюць на новы ўзровень духоўныя каштоўнасці народаў свету.

Асноўная ***мэта*** вучэбнай вучэбнай дысцыпліны – раскрыць багацце, шматстайнасць, непаўторнасць сусветнай літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, а таксама выявіць яе сувязі з літаратурным працэсам у Беларусі.

***Задачы*** вучэбнай дысцыпліны:

– акрэсліць асноўныя этапы развіцця літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, заканамернасці літаратурнага працэсу ў розных рэгіёнах свету, іх канкрэтна-гістарычны і разам з тым «вечны» сэнс;

– абазначыць тыпалагічныя адметнасці літаратуры і культуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, якія ўвасобіліся ў творчасці прадстаўнікоў іншых народаў і пакаленняў;

– даць звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, якія адыгралі асаблівую ролю ў літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння;

– ахарактарызаваць асноўныя творы замежных пісьменнікаў літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, якія складаюць «залаты фонд» мастацтва слова, выявіць іх агульначалавечы змест, актуалізаваць іх значэнне ў айчынным літаратурным працэсе;

– раскрыць сэнсавую глыбіню, шматзначнасць і непаўторнасць вобразаў замежных пісьменнікаў літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, якія набылі агульначалавечае значэнне ў кантэксце іншанацыянальных літаратур;

– выявіць нацыянальную адметнасць і акрэсліць агульнае ў змястоўна-фармальнай структуры твораў пісьменнікаў народаў свету эпохі Сярэднявечча і Адраджэння.

Вывучэнне дысцыпліны «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» дазволіць сфарміраваць у студэнта ўяўленне пра

непарыўнасць літаратурнага развіцця ў маштабах агульначалавечай культуры і яго дыскрэтнасць у адлюстраванні асаблівасцей літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, зразумець, што мастацтва слова – важны сродак фарміравання маральна-каштоўнасных арыенціраў маладога чалавека, яго духоўна-эстэтычнага патэнцыялу, творчай запатрабаванасці.

Асноўная ўвага пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» надаецца лекцыям, у час якіх выкладчык знаёміць студэнтаў з тымі паняццямі, характарыстыкамі і з’явамі, якія складаюць аб’ект вывучэння, раскрывае канкрэтна-гістарычны сэнс і неўміручасць у стагоддзях творчых адкрыццяў пісьменнікаў, дапамагае ўбачыць непаўторнасць індывідуалізаваных мастацкіх вобразаў і іх нацыянальную адметнасць, выяўляе багацце нацыянальнага і індывідуальнага чалавечага вопыту, увасобленага ў творчай спадчыне прадстаўнікоў літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння. На практычных занятках асаблівая ўвага аддадзена вывучэнню тых твораў замежных пісьменнікаў эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, з дапамогай якіх раскрываецца адметнасць літаратурнага працэсу асобнай краіны і выяўляецца маштабнасць, універсальнасць творчага пранікнення аўтара ў глыбіні агульначалавечага, «вечнага».

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.*** Вучэбная дысцыпліна «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» для спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) уваходзіць у кампанент дысцыплін установы адукацыі. Дадзеная дысцыпліна звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Гісторыя беларускай літаратуры XI–XVI ст.», «Уводзіны ў літаратуразнаўства».

***Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнай кампетэнцыі СК-10: Характарызаваць асаблівасці развіцця нацыянальных літаратур на розных гістарычных этапах, улічваючы заканамернасці літаратурнага працэсу замежных краін як цэласнай з’явы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць:***

– асноўныя кірункі, стылі, асаблівасці літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння;

– этапы і заканамернасці літаратурнага працэсу эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, асаблівасці літаратуры еўрапейскіх краін;

– традыцыйнае і наватарскае ў літаратурным працэсе эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, у творчасці прадстаўнікоў аднаго кірунку, таго ці іншага пісьменніка;

– жыццёвы і творчы лёс пісьменнікаў, якія аказалі найбольшы ўплыў на развіццё літаратуры эпохі Сярэднявечча і Адраджэння;

– тэксты замежных пісьменнікаў, якія прапануюцца для абавязковага вывучэння;

– факты і спецыфіку функцыянавання сусветнай літаратурнай класікі ў беларускай культуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***умець:***

– выяўляць агульнае і асаблівае ў развіцці літаратурнага працэсу эпохі Сярэднявечча і Адраджэння ў яго суадносінах з нацыянальным;

– вызначаць тыпалагічныя асаблівасці, характэрныя для таго ці іншага літаратурнага кірунку, метаду, стылю эпохі Сярэднявечча і Адраджэння;

– аналізаваць твор у кантэксце эпохі Сярэднявечча і Адраджэння, кірунку, творчасці пісьменніка;

– аналізаваць мастацкі твор з пазіцый яго фармальна-змястоўных кампанентаў;

– характарызаваць спадчыну пісьменніка, яго сюжэты і вобразы праз іх успрыманне, інтэрпрэтацыю ў творчасці прадстаўнікоў іншай эпохі і нацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць:***

– адпаведным паняцційным і тэрміналагічным апаратам;

– навыкамі розных спосабаў аналізу літаратурнага твора.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

***Асноўнымі тэхналогіямі навучання з’яўляюцца:*** праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання; асобасна арыентаваная тэхналогія (улік індывідуальна-асобасных асаблівасцей студэнтаў, захаванне прынцыпу варыятыўнасці); інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (мультымедыйныя прэзентацыі, online-тэсты, інтэрактыўныя заданні ў сістэмах дыстанцыйнага навучання і інш.).

***Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.*** Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна, напісанне рэфератаў, падрыхтоўка дакладаў для выступлення на студэнцкіх навуковых канферэнцыях і інш.

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, форма прамежкавай атэстацыі.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Антычная літаратура і літаратура эпохі Сярэднявечча і Адраджэння» разлічана на 108 вучэбных гадзін на 2 курсе ў 3 семестры. З іх 46 аўдыторных гадзін: 22 лекцыйных і 24 гадзіны практычных заняткаў, 62 гадзіны адведзена на

самастойную работу. Форма адукацыі – дзённая. Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

| **Семестр** | **Усяго** | **Лекцыі** | **Практычныя** | **Самастойная работа студэнтаў** | **Форма прамежкавай атэстацыі** |
|---|---|---|---|---|---|
| III | 108 | 22 | 24 | 62 | Залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

***Тэма 1. Міфалогія***

Стадыяльнасць (перыядызацыя) сусветнага літаратурнага працэсу: традыцыйныя і найноўшыя пункты гледжання. Паняцці «сусветная літаратура», «сусветны літаратурны працэс», «рэгіянальная (занальная) літаратура», «нацыянальны літаратурны працэс».

Міфалогія. Міфалогія як сістэма паганскіх міфаў, ідэалогія абшчынна-родавага ладу, крыніца сусветнай літаратуры. Сінтэз у міфе пазнання, веры, выдумкі. Мастацкі свет старажытнага міфа як мадэлі чалавечай цывілізацыі і маралі. Міф як з’ява культуры. Філасофскі і гістарычны сэнс. Маральны і сакральны змест, мастацкая і эстэтычная каштоўнасць міфа. Віды міфаў. Паэтыка. Логіка міфа. Яго сімволіка. Старажытныя міфалогіі свету: егіпецкая, грэчаская, рымская, індыйская, германская. Славянская міфалогія.

Вечныя вобразы антычнай міфалогіі ў беларускім кантэксце: Праметэй – у творах Я. Купалы, М. Танка, У. Караткевіча, Ц. Гартнага; Эрас – у паэме Ю. Жулаўскага «Эрас і Псіха», цыкле «Эрас» М. Багдановіча; Ікар і Дзедал – у перакладзе (з Авідзія) М. Багдановіча, у «Паэме калодзежа» А. Разанава і інш.

***Тэма 2. Антычная літаратура: агульная характарыстыка***

Першая з еўрапейскіх літаратур – антычная: літаратура Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. Міфалогія старажытных грэкаў і рымлян. Першыя помнікі літаратуры на тэрыторыі Еўропы, спецыфіка іх запісу і захавання. Мова помнікаў. Перыядызацыя старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай літаратур. Узнікненне грэчаскай літаратуры на аснове міфалогіі, старажытнарымскай – на аснове народнай творчасці і старажытнагрэчаскіх традыцый. Значэнне антычнай літаратуры для станаўлення і развіцця: а) трох літаратурных родаў: эпасу, лірыкі, драмы; б) двух відаў мастацкага слова – паэзіі і прозы; в) жанраў: буколіка, гімн, гіпаталама, драма, ідылія, камедыя, ода, пасланне, сатыра, трагедыя, элегія, эпіграма, эпітафія і інш.; г) паэтыкі (антычнае вершаскладанне, тропы, стылістычныя і рытарычныя фігуры і інш.); д) асобных навук і мастацтваў у межах літаратуры: літаратуразнаўства і рыторыкі, эстэтыкі і філасофіі, гістарыяграфіі і красамоўства і інш.; е) важнейшых філасофскіх і эстэтычных паняццяў і катэгорый: гармонія, катарсіс, калакагацыя, мера, рытм, сіметрыя і г.д. Ідэал гарманічна развітай асобы: гармонія цела і духа, фізічнага і разумовага, знешняга і ўнутранага, прыгажосці і дабра. «Аретэ» як дабрачыннасць, высакароднасць у разуменні старажытных грэкаў (розныя перыяды). Новы ідэал дабрачыннасці («віртус») у Старажытным Рыме.

***Тэма 3. Антычная літаратура. Эпас***

Класічныя ўзоры эпасу перыяду разлажэння першабытна-грамадскага ладу (індыйскія эпасы «Махабхарата» і «Рамаяна» і інш.). Тыпалогія эпасу. Эпас у старажытнагрэчаскай літаратуры. Эпас Гамера. Гісторыя Трoі і Траянскай вайны.

Міфы траянскага цыклу і дзеянне «Іліяды». Асноўная тэма – «гнеў... Ахілеса, Пелейвага сына», тыпалагічная паралель з вобразамі Гільгамеша, Раланда і іншых эпічна маладых герояў. Увасабленне ў вобразе Ахілеса гераічнага ідэалу старажытных грэкаў. Гамераўскае пытанне. «Адысея»: падобнае і адрознае з «Іліядай». Вобраз Адысея як архетып вандроўніка. Вобраз Пенелопы і сусветная традыцыя ў стварэнні жаночага вобраза.

«Энеіда» старажытнарымскага паэта Вергілія. Традыцыі Гамера. Услаўленне Рымскай імперыі ў асобе траянскага героя Энея. Італійская зямля як пераемніца славы траянцаў, славы адроджанай наноў Троі. Неаднастайнасць тлумачэнняў «Энеіды». Пераасэнсаванне сюжэта ў бок зніжэння вобразаў, яго травесціраванне: беларуская паэма «Энеіда навыварат» В. Равінскага. Пераклады класічных узораў эпасу на беларускую мову: з «Іліяды» – Б. Тарашкевіча, Ю. Дрэйзіна, з «Адысеі» – А. Клышкі і інш. Думка Я. Коласа пра стварэнне нацыянальнага беларускага эпасу на аснове народных казак і паданняў. Адлюстраванне вобразаў эпасу Гамера ў музыцы.

***Тэма 4. Антычная лірыка***

4.1. Старажытнагрэчаская лірыка. Паходжанне назвы, сувязь слова і музыкі. Старажытная народная паэзія як крыніца нараджэння жанраў лірыкі. Элементы жывёльнага эпасу, алегарызм, іншасказанне ў байках. Байкі Эзопа. Байкапісцы ў сусветнай літаратуры і на Беларусі. Меліка (мелічная паэзія) як адна з форм антычнай лірыкі (VII – VI стст. да н. э.). Сольная меліка. Анакрэонт – пясняр вальнадумства, бесклапотнасці і любові да жыцця – анакрэантычныя матывы ў сусветнай паэзіі (у т. л. у М. Багдановіча). Харавая лірыка (дыфірамбы, эпінікіі, парфеніі і іншыя жанры; аднаўленне вобразаў верша Алкмана «Спят вершины высокие гор и бездн провалы...» ў паэзіі Гётэ, М. Лермантава, В. Верасаева).

4.2. Дэкламацыя твора пад акампанемент флейты – формы элегіі і ямба. Элегія як старажытнагрэчаская вершаваная форма, яе аснова – элегічны двуверш (гекзаметр і пентаметр). Яе ўзнікненне з пахавальнай заплачкі. Разнастайнасць тэматыкі элегій. Пашырэнне малых форм у александрыйскай паэзіі: элегія, ямб, гімн, эпіграма, эпітафія, ідылія, буколіка. Творчасць Калімаха, Феакрыта.

4.3. Паэзія Старажытнага Рыма. Агульная характарыстыка. Дзве традыцыі адлюстравання тэмы кахання ў лацінскай паэзіі: суб’ектыўная (Катул, гісторыя кахання да Лесбіі: тэмы кахання-сяброўства і кахання-жадання ў яго паэзіі) і аб’ектыўная (аб каханні багоў і багінь, любоўныя элегіі ў творчасці Авідзія).

4.4. Эліністычная паэзія: услаўленне Рымскай імперыі ў творчасці Вергілія, Гарацыя; паэт апазіцыйнага кірунку Авідзій. «Оды» і іншыя творы Гарацыя. Вобразы ідэальнай утапічнай краіны Аркадыі ў «Буколіках» Вергілія. «Трыстыі» і «Пасланні з Понта» Авідзія.

Жанр элегіі ў беларускай паэзіі (Ф. Багушэвіч, М. Багдановіч, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка і інш.).

***Тэма 5. Антычная драма***

5.1. Драма як адзін з трох родаў мастацкай літаратуры. Аснова – дзеянне. Фарміраванне драмы ў старажытных абрадавых дзействах. Класічны перыяд у развіцці старажытнагрэчаскай літаратуры.

5.2. Рымскі тэатр. Тры віды антычнай драмы: трагедыя (Эсхіл, Сафокл, Эўрыпід, Сенека), камедыя (Арыстафан, Менандр, Плаўт, Тэрэнцый), сатыраўская драма. Распрацоўка сюжэтных ліній старажытных міфаў. Адлюстраванне гістарычных падзей. Трагедыі і камедыі старажытных аўтараў як узоры класікі.

***Тэма 6. Антычная проза***

6.1. Станаўленне прозы як літаратурнай формы новага светаўспрымання. Лагографы – першыя аўтары старажытнагрэчаскай прозы. Гістарычная проза ў літаратуры Старажытнай Грэцыі: «Гісторыя» Герадота; «Гіпакратаў корпус» Гіпакрата; «Гісторыя Пелапанескай вайны» Фукідзіда. Старажытнарымскія летапісы – аналы; творы Салюсцыя, Ціта Лівія, Тацыта; «Паралельныя жыццяпісы» Плутарха.

6.2. Першыя ўзоры празаічных жанраў, што дайшлі да нашага часу, – творы філосафаў (Фалес, Анаксімен, Геракліт, Ксенафан і інш.). Проза сафістаў – настаўнікаў філасофіі і красамоўства. Палітычнае красамоўства Дэмасфена. Філасофская проза IV ст. да н.э. – дыялогі Платона, перайманне традыцый дыялогу рымскімі аўтарамі (Цыцэрон). «Паэтыка» Арыстоцеля. Вучэнне Арыстоцеля па тэорыі літаратуры.

6.3. Раман у антычнай літаратуры: рымскай («Сатыры», або «Сатырыкон», Петронія; Апулей як стваральнік фантастычнага рамана на лацінскай мове – «Метамарфозы, або Залаты асёл»). Грэчаскі раман: гісторыя пра Дафніса і Хлою, пра цнатлівае каханне на ўлонні прыроды. Псіхалагізм «Дафніса і Хлоі» Лонга. Пастаральныя матывы. Адухаўленне прыроды, прысутнасць у ёй багоў і багінь.

Роля антычнай прозы ў станаўленні нацыянальнай літаратуры, арыгінальнай творчасці, у разуменні сутнасці чалавека, пашырэнні свецкага пачатку ў літаратуры. Шырокае знаёмства з антычнымі празаікамі ў Беларусі: зварот да іх нацыянальных аўтараў (на лацінскай, польскай, беларускай, рускай мовах), перайманні ўзораў, аднаўленне сюжэтаў і вобразаў у новым гісторыка-культурным кантэксце.

***Тэма 7. Літаратура Сярэднявечча: агульная характарыстыка***

7.1. Літаратура Сярэднявечча: перыядызацыя. Новыя этнічныя супольнасці як аснова зараджэння феадальнай культуры. Утварэнне феадальных дзяржаў і фарміраванне структуры феадальнага грамадства – перадумовы развіцця літаратуры ў еўрапейскіх краінах. Саслоўны характар грамадства і наяўнасць у ёй дзвюх культур: афіцыйнай, рэлігійнай і народнай, «смехавай» (М. Бахцін). Культурныя зоны (рэгіёны) Сярэднявечча. Спецыфіка мастацкага метаду і склад сярэднявечнай літаратуры. Алегарызм і сімвалізм сярэднявечнага мыслення. Кананічнасць (традыцыйнасць) структурна-ўтваральных элементаў – топасаў

(сюжэты, тыпы герояў, выяўленчыя сродкі). Жанравая рэгламентацыя і каштоўнасная іерархія жанраў. Вытокі літаратуры: антычная літаратура, хрысціянства, народная творчасць.

7.2. Хрысціянская літаратура: агульная характарыстыка. Прадстаўнікі. Дзейнасць Амбросія Медыяланскага, Іераніма, Аўгусціна Блажэннага. Творы ўсходнехрысціянскай патрыстыкі. Іаан Златавуст як ідэал прапаведніка. Сістэматызацыя грэчаскай патрыстыкі Іаанам Дамаскінам. Жанры агіяграфіі, гімнаграфіі, гістарыяграфіі.

Хрысціянская літаратура візантыйскага рэгіёна на беларускіх землях. Кірыла Тураўскі – «рускі Златавуст». Выданне асноўных твораў Іаана Златавуста («Слова пра цярплівасць і богаўхваленне», XVI ст., «Маргарыт» у пер. Л.Зізанія, Л.Карповіча). Самыя старыя спісы «Златаструя» і «Златавуста». «Споведзь веры» Іаана Дамаскіна ў якасці катэхізісу да XVII ст. Распаўсюджванне агіяграфіі на беларускіх землях (зборнікі «Чэцці Мінеі», пацерыкі). Творы Яфрэма Сірына. Жанр манаскай хронікі і яе ўплыў на фарміраванне воінскай аповесці, на развіццё хронікі.

7.3. Лацінская літаратура. Лацінская мова – адна з асноў новай феадальнай культуры, яе пранікненне на тэрыторыю Беларусі. Клерыкальныя жанры ўласна дыдактычнага кірунку: зярцала і пропаведзь «Рымскія дзеянні». Свецкія жанры: гістарыяграфія – летапіс і хроніка. Эпічная паэзія (жывёльны эпас XII ст. «Ізенгрым»), лірычная паэзія – элегіі, пасланні.

7.4. Паэзія вагантаў: тэма абжорства, віна і застолля («Всепьянейшая літургія»), любоўная тэматыка. Вершы на сатырычную тэму. Буранскі рукапіс, або «Карміна Бурана» (XIII ст., звыш 200 вершаў): любоўныя і застольныя песні (свецкая) і рэлігійная паэзія.

Зборнік «Вялікае зярцала», Галандыя, пер. на бел. мову з польскай, XVII ст. «Рымскія дзеянні» складзены ў XIII ст. у Англіі, праз польскае пасрэдніцтва трапляюць на Беларусь у XVIII ст. Аднайменная кантата Карла Орфа (1937 г.). Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «Карміна Бурана» на сцэне Нацыянальнага тэатра балета (з 1998 г.)

***Тэма 8. Народна-эпічная літаратура***

8.1. Эпас I перыяду (разлажэння першабытнаграмадскага ладу). Помнікі. Тыпалогія. Кельцкі эпас: ірландскія сагі. Дзве групы саг. Легендарны герой гераічных саг гуладскага цыклу Кухулін. Легендарная біяграфія Кухуліна – ад гістарычнага да міфалагічнага.

8.2. Гераічны эпас II перыяду (эпохі феадалізму). Помнікі. Тыпалогія. Трансфармацыя сюжэта пра Сігурда – Зігфрыда. Сігурд – герой «Старэйшай Эды» (помніка скандынаўскай эпічнай паэзіі). Легендарная біяграфія Сігурда. Зігфрыд – герой «Песні пра нібелунгаў» (помніка нямецкага гераічнага эпасу): легендарная біяграфія героя. Увасабленне ў творах сацыяльна-гістарычных прыкмет часу.

8.3. Французскі эпас «Песня пра Раланда»: параўнальнае са «Словам пра паход Ігаравы».

Вобразы «Песні» і «Слова» ў творах мастацтва – вобраз Карла Вялікага ў ілюстрацыях Г. Дарэ, бронзавая статуэтка імператара IX ст., опера О. Мермэ «Раланд у Рансевальскай цясніне», опера «Князь Ігар» А.П. Барадзіна (скончана Н.А. Рымскім-Корсакавым і А.К. Глазуновым). Вобразы гераічнага эпасу ў музыцы (тэтралогія Р. Вагнера «Пярсцёнак нібелунгаў»).

Эпас паўднёвых славян: цыкл пра Косава поле (песні «Цар Лазар і царыца Міліца», «Смерць маці Югавічаў») і цыкл пра Марка Каралевіча (легендарная біяграфія героя). Вобразы Ефрасімы і Вукашына. Тыпалагічныя сыходжанні, нацыянальна-гістарычныя адрозненні з творамі іншых народаў.

***Тэма 9. Літаратура Сталага Сярэднявечча***

9.1. Рыцарская (куртуазная) літаратура: гісторыка-культурны кантэкст. Паняцці «рыцарская дабрачыннасць», «куртуазія». Тыпалогія рыцарскай літаратуры. Паэзія трубадураў (Праванс), трувераў (поўнач Францыі), мінезінгераў (Германія). Рыцарскі раман. Цыклы французскага рыцарскага рамана: антычны; артураўскі, або брэтонскі (пра караля Артура); усходневізантыйскі. Легенда пра Трыстана і Ізольду: асноўныя версіі. Элементы сюжэта па розных крыніцах, аднаўленне біяграфіі Трыстана, гісторыя яго кахання з Ізольдаю, жонкаю караля Марка.

Перастварэнне матыву «кахання здалёк» французскім драматургам XIX ст. Э. Растанам («Прынцэса Мара»). «Александрыя», арыгінал з Егіпта на грэчаскай мове, на Беларусі ў XV ст.; «Троя» – помнік беларускай перакладной літаратуры XV ст. Беларуская «Аповесць пра Трышчана» – помнік беларускай перакладной літаратуры XVI ст. Рэцэнзія М. Багдановіча на апрацоўку гэтай легенды, выкананую Ж. Бедзье. Опера Р. Вагнера «Трыстан і Ізольда», яе пастаноўка на сцэне Нацыянальнага тэатра оперы і балета (балет 1963 г.). Раман пра Трыстана на сцэне Нацыянальнага тэатра імя Я. Купалы (Малая сцэна, версія С. Кавалёва). Беларускія пераклады помнікаў рыцарскай літаратуры.

9.2. Гарадская літаратура. Сярэднявечны горад – складаны сацыяльны арганізм. Сатыра і дыдактыка як асноўныя кірункі. Жанры: фабліо (у Францыі), шванк (у Германіі). Зборнік шванкаў Штрыкера «Поп Аміс». Жывёльны эпас у французскай літаратуры («Раман пра Рэнара») і алегарычная паэма («Раман па Ружу»). Тыпалагічнае падабенства з казкамі іншых народаў. Ф. Віён – першы французскі нацыянальны паэт.

9.3. Фабліо «Завяшчанне казла» і беларуская сацыяльна-бытавая казка «Пахаванне казла»: падабенства праблемна-тэматычных планаў, матываў, вобразаў. Містэрыяльная драма «Цар Ірад» у Беларусі. Народная сцэна «Ірадзіяда, стары Рыгор і Шчогаль», дэманічная сутнасць вобраза; «Цар Ірад» на сцэне Мінскага тэатра лялек.

***Тэма 10. Дантэ. Боская камедыя***

Асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху. Дантэ – «апошні паэт Сярэднявечча і разам з тым першы паэт Новага часу» (Ф. Энгельс): па кнізе «Новае жыццё» (сімволіка колераў, лічбаў, алегарызм вобразаў) і новае, гуманістычнае светасузіранне (абагаўленне чалавека, гармонія цялеснага і духоўнага ў ім). «Боская камедыя»: жанр, кампазіцыя, структура мастацкага вобраза. Пакуты і цені дантава Пекла. Вобразы Чысцілішча. Дантэ і Вергілій. Дантэ і Беатрычэ. Зямны Рай і Нябесны Рай. Гуманістычныя ідэалы паэта.

Вобразы Дантэ ў ілюстрацыях С. Бацічэлі, Л. Сіньярэлі, Г. Джыральдзі, у творах Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэля. Дантэ і беларуская культура: вобразы пекла і рая ў беларускіх казках, у творах пісьменнікаў; пераклады і перайманні з Дантэ, прысвячэнні.

***Тэма 11. Адраджэнне: агульная характарыстыка***

Асноўныя паняцці Адраджэння, паходжанне назвы. Перыядызацыя. Паўночнае Адраджэнне. Канцэпцыя чалавека і свету. Абагаўленне чалавека. Гармонія чалавека і свету. Рэабілітацыя зямнога, цялеснага. Паняцці «свабода», «рэнасансны індывідуалізм», «рэнесансны рэалізм». Утапічная літаратура. Тытаны Адраджэння. Адраджэнне ў славян. Прага як культурны асяродак. Кнігадрукаванне. Літаратура на нацыянальных мовах.

***Тэма 12. Новыя жанры ў літаратуры***

Санет: адкрыццё чалавека і свету. Санет як цвёрдая страфічная форма. Філасофія санета (паводле І. Бехера). Артыкул М.Багдановіча «Санет». Санеты Ф. Петраркі – першапачынальніка лірычнай паэзіі. Санеты Шэкспіра. Беларускія пераклады санетаў, ілюстрацыі беларускіх мастакоў (Г. Паплаўскі, В.Мікіта).

Навела: паходжанне назвы, традыцыі ў ёй іншых жанраў. Стваральнік навелы Адраджэння Дж. Бакача – раман у навелах «Дэкамерон». М. Сервантэс – «Павучальныя навелы».

Тыпалагічная паралель жанру – авантурна-навелістычныя казкі ў беларускім фальклоры («За што мужык папу бараду агаліў», «Сцізорык зламаўся, або Асцярожны пасланец», «Мужык, пан і ксёндз», «Несцерка» і інш.). «Ліцэнцыят Відрыера» Сервантэса ў беларускім перакладзе.

Народныя кнігі: асаблівасці стварэння і распаўсюджвання. Нямецкія – «Займальная кніжка пра Ціля Эйленшпігеля», «Гісторыя пра д-ра Ёгана Фаўста, знакамітага чараўніка і чарнакніжніка», «Шыльдбюргеры»: кантэкст «літаратуры пра дурняў» (у т.л. вобразы «дурных людзей» у беларускіх казках).

***Тэма. 13. Нацыянальныя асаблівасці Адраджэння ў краінах Еўропы***

Італьянскае Адраджэнне. Літаратура Трэчэнта (паэзія «новага пяшчотнага стылю», Дантэ, Петрарка, Бакача), Кватрачэнта (М.Баярда «Закаханы Раланд»), Чынквечэнта (Л. Арыёста «Неўтаймаваны Раланд», працяг паэмы М. Баярда і самастойны твор, Т. Таса «Вызвалены Іерусалім»).

Французскае Адраджэнне. «Плеяда» і яе лідэр П. Рансар. Проза: Маргарыта Наварская («Гептамерон»). Ф. Рабле: складанасць жыццёвага і творчага шляху. Раман «Гарганцюа і Пантагруэль»: амбівалентнасць, карнавалізацыя вобразаў (кніга М.Бахціна «Франсуа Рабле і народная культура Сярэднявечча і Рэнесанса»). Першапачынальнік літаратурнай формы эсэ М. Мантэнь.

Англійскае Адраджэнне. Пачатак творчасці Дж.Чосера. Пераклад Бібліі ў XIV ст. Проза XV ст. Росквіт паэзіі і драмы ў XVI ст. Творчасць Шэкспіра. Сістэмаўваральныя канфлікты: барацьба закаханых за свае пачуцці, праблема ўлады, пошук чалавекам мяжы паміж дабром і злом і інш. Вялікія трагедыі Шэкспіра – «Гамлет», «Кароль Лір».

Іспанскае Адраджэнне. Махлярскі раман. Асноўныя рысы жанра. Фальклорныя вытокі сюжэта. Вобраз Вобраз пікаро. «Залатое стагоддзе» іспанскай драматургіі: Лопэ дэ Вэга. «Сабака на сене»: асноўны канфлікт, праблема гонару. Творчасць Мігеля дэ Сервантэса. Раман «дон Кіхот: задума і ўвасабленне. Кампазіцыя твора, цэнтральныя вобразы рамана. Дон Кіхот як «вечны вобраз». Цірса дэ Моліна і яго п’еса «Севільскі свавольнік, альбо Каменны госць» – першая драматургічная апрацоўка легенды пра Дон Жуана. Вобраз Дон Жуана ў сусветнай літаратуры.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**«АНТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА І ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА І АДРАДЖЭННЯ»**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Лекцыі | Практычныя заняткі | Ссамастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **АНТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА І ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА І АДРАДЖЭННЯ** | **22** | **24** | **62** | | | |
| **1.** | **Міфалогія** | **1** | | **4** | | | |
| | 1. Міфалогія як сістэма паганскіх міфаў, ідэалогія абшчынна-родавага ладу, крыніца сусветнай літаратуры. Мастацкі свет старажытнага міфа як мадэлі чалавечай цывілізацыі і маралі. Міф як з’ява культуры. Філасофскі і гістарычны сэнс. Маральны і сакральны змест, мастацкая і эстэтычная каштоўнасць міфа.<br>2. Віды міфаў. Паэтыка. Логіка міфа. Яго сімволіка. Старажытныя міфалогіі свету: егіпецкая, грэчаская, рымская, індыйская, германская. Славянская міфалогія. | 1 | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1]<br>[2]<br>[6] | Вусная праверка |
| **2.** | **Антычная літаратура: агульная характарыстыка** | **1** | | **4** | | | |
| | 1. Літаратура Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. Перыядызацыя.<br>2. Значэнне антычнай літаратуры для станаўлення і развіцця: а) трох літаратурных родаў: эпасу, лірыкі, драмы; б) двух відаў мастацкага слова – паэзіі і прозы; в) жанраў: буколіка, гімн, гіпаталама, драма, ідылія, камедыя, ода, пасланне, сатыра, трагедыя, элегія, эпіграма, эпітафія і інш. | 1 | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1]<br>[2]<br>[6] | Вусная праверка |
| **3.** | **Антычная літаратура. Эпас** | **1** | **2** | **4** | | | |
| | 1. Эпас у старажытнагрэчаскай літаратуры. Эпас Гамера. Гісторыя Троі і Траянскай вайны. Міфы траянскага цыклу і дзеянне «Іліяды». «Адысея»: вобраз Адысея як архетып вандроўніка. Вобраз Пенелопы і | 1 | | 4 | Мастацкія тэксты | [1]<br>[2]<br>[6] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | сусветная традыцыя ў стварэнні жаночага вобраза.<br>2. «Энеіда» старажытнарымскага паэта Вергілія. Услаўленне Рымскай імперыі ў асобе траянскага героя Энея. Неаднастайнасць тлумачэнняў «Энеіды». Пераасэнсаванне сюжэта ў бок зніжэння вобразаў, яго травесціраванне: беларуская паэма «Энеіда навыварат» В. Равінскага. | | 2 | | | | Выступленне з паведамленнямі. |
| **4.** | **Антычная лірыка** | **1** | **2** | **4** | | | |
| 4.1. | 1. Старажытнагрэчаская лірыка. Паходжанне назвы, сувязь слова і музыкі. Старажытная народная паэзія як крыніца нараджэння жанраў лірыкі.<br>2. Байкі Эзопа. Байкапісцы ў сусветнай літаратуры і на Беларусі. Меліка (мелічная паэзія) як адна з форм антычнай лірыкі (VII – VI стст. да н. э.). Сольная меліка.<br>3. Анакрэонт – пясняр вальнадумства, бесклапотнасці і любові да жыцця. Харавая лірыка (дыфірамбы, эпінікіі, парфеніі і іншыя жанры. | 1 | | 4 | Тэксты антычнай лірыкі | [1]<br>[2]<br>[6] | Вусная праверка |
| 4.2. | 1. Дэкламацыя твора пад акампанемент флейты – формы элегіі і ямба.<br>2. Элегія як старажытнагрэчаская вершаваная форма. Разнастайнасць тэматыкі элегій.<br>3. Пашырэнне малых форм у александрыйскай паэзіі: элегія, ямб, гімн, эпіграма, эпітафія, ідылія, буколіка.<br>4. Творчасць Калімаха, Феакрыта. | | 1 | | Тэксты антычнай лірыкі | [1]<br>[2]<br>[6] | Рэфераты студэнтаў |
| 4.3. | 1. Паэзія Старажытнага Рыма. Агульная характарыстыка.<br>2. Дзве традыцыі адлюстравання тэмы кахання ў лацінскай паэзіі: суб’ектыўная (Катул, гісторыя кахання да Лесбіі: тэмы кахання-сяброўства і кахання-жадання ў яго паэзіі) і аб’ектыўная (аб каханні багоў і багінь, любоўныя элегіі ў творчасці Авідзія). | | 1 | | Тэксты антычнай лірыкі | [1]<br>[2]<br>[6] | Рэфераты студэнтаў |
| 4.4. | 1. Эліністычная паэзія: услаўленне Рымскай імперыі ў творчасці Вергілія, Гарацыя.<br>2. Паэт апазіцыйнага кірунку Авідзій.<br>3. «Оды» і іншыя творы Гарацыя. | | | | Тэксты антычнай лірыкі | | Вусная праверка |
| **5.** | **Антычная драма** | **1** | **2** | | | | |
| 5.1. | 1. Драма як адзін з трох родаў мастацкай літаратуры. Аснова – дзеянне. Фарміраванне драмы ў старажытных абрадавых дзействах.<br>2. Класічны перыяд у развіцці старажытнагрэчаскай літаратуры. | 1 | | | Ілюстрацыйны матэрыял | [1]<br>[2]<br>[6] | Вусная праверка |
| 5.2. | 1. Рымскі тэатр. Тры віды антычнай драмы: трагедыя (Эсхіл, Сафокл, | | 2 | | Тэксты | [1] | Гутарка |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Эўрыпід, Сенека), камедыя (Арыстафан, Менандр, Плаўт, Тэрэнцый), сатыраўская драма.<br>2. Распрацоўка сюжэтных ліній старажытных міфаў. Адлюстраванне гістарычных падзей.<br>3. Трагедыі і камедыі старажытных аўтараў як узоры класікі. | | | | трагедый і камедый | [2]<br>[6] | |
| **6.** | **Антычная проза** | **2** | **2** | **8** | | | |
| 6.1. | 1. Станаўленне прозы як літаратурнай формы новага светаўспрымання. Лагографы – першыя аўтары старажытнагрэчаскай прозы.<br>2. Гістарычная проза ў літаратуры Старажытнай Грэцыі: «Гісторыя» Герадота; «Гіпакратаў корпус» Гіпакрата; «Гісторыя Пелапанескай вайны» Фукідзіда. Старажытнарымскія летапісы – аналы; творы Салюсцыя, Ціта Лівія, Тацыта; «Паралельныя жыццяпісы» Плутарха. | 1 | | 2 | Мастацкія тэксты | [1]<br>[2]<br>[6] | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 6.2. | 1. Першыя ўзоры празаічных жанраў, што дайшлі да нашага часу, – творы філосафаў (Фалес, Анаксімен, Геракліт, Ксенафан і інш.). Проза сафістаў – настаўнікаў філасофіі і красамоўства.<br>2. Палітычнае красамоўства Дэмасфена.<br>3. Філасофская проза IV ст. да н.э. – дыялогі Платона, перайманне традыцый дыялогу рымскімі аўтарамі (Цыцэрон).<br>4. «Паэтыка» Арыстоцеля. Вучэнне Арыстоцеля па тэорыі літаратуры. | 1 | 1 | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя | [1]<br>[2]<br>[6] | Вусная праверка |
| 6.3. | 1. Раман у антычнай літаратуры: рымскай («Сатыры», або «Сатырыкон», Петронія; Апулей як стваральнік фантастычнага рамана на лацінскай мове – «Метамарфозы, або Залаты асёл»).<br>2. Грэчаскі раман: гісторыя пра Дафніса і Хлою, пра цнатлівае каханне на ўлонні прыроды. Псіхалагізм «Дафніса і Хлоі» Лонга. Пастаральныя матывы. Адухаўленне прыроды, прысутнасць у ёй багоў і багінь. | | 1 | 4 | Тэксты твораў | [1]<br>[2]<br>[6] | Вусная праверка |
| **7.** | **Літаратура Сярэднявечча: агульная характарыстыка** | **2** | **2** | **6** | | | |
